## РЭЦЭНЗІІ

# З ГЛЫБІНЬ СТАГОДДЗЯ

Прыкладна дзесяць гадоў таму назад у групы беларускіх гісторыкаў і літаратараў узнікла ідэя выдання штогодніка, дзе б друкаваліся новыя літаратурныя матэрыялы, цікавыя архіўныя знаходкі і дакументы, давалася аб'ектыўнае асэнсаванне некаторых старонак гісторыі беларускай культуры. Гэту ідэю падтрымала выдавецтва «Мастацкая літаратура», але зборнік пад назвай «Спадчына» так і не выйшаў.

Гэта ідэя здзейснілася толькі ў 1990 г., але гісторыка-літаратурны зборнік мае цяпер назву «Шляхам гадоў» *. Складальнік — вядомы даследчык Г. Кісялёў.

У чым жа вартасць гісторыка-літаратурнага зборніка «Шляхам гадоў»? Па-першае, ён адрозніваецца маштабам ахопу цікавых падзей гісторыка-літаратурнага жыцця, дакладней, ахоплівае іх на працягу амаль трохсот гадоў (XVIII—XX стст.).

Па-другое, гэта кніга здзіўляе чытача дыяпазонам розных жанраў. Сюды ўвайшлі думкі вядомых беларускіх пісьменнікаў аб сваёй творчасці, эпісталярная спадчына, публікацыі, пошукі і знаходкі, клопаты тэкстолагаў, літаратурныя пенаты, пераклады ранніх польскамоўных вершаў Янкі Купалы, роздум, рэцэнзіі, хроніка, весці з архіваў, музеяў, бібліятэк.

Па-трэцяе, пераважная большасць прадстаўленых у зборніку матэрыялаў знаёміць чытачоў з невядомымі старонкамі жыцця і дзейнасці вядомых людзей: Уладзіміра Леніна і Льва Троцкага, Фелікса Дзяржынскага і Майсея Урыцкага, Змітрака Жылуновіча (Цішкі Гартнага) і Уладзіміра Караткевіча, Якуба Коласа, Янкі Купалы і Аляксея Новікава-Прыбоя, Сяргея Астрэйкі і Браніслава Тарашкевіча, Максіма Багдановіча і Алеся Гаруна, Францішка Багушэвіча і братоў Каліноўскіх, Аляксандра Рыпінскага і Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, Аляксандра Ельскага, Міхала Карыцкага.

Для многіх чытачоў, аматараў беларускай паэзіі, сапраўдным падарункам будзе знаёмства з паэтычнай спадчынай Сяргея Астрэйкі, які трагічна загінуў у 1937 г. у 25-гадовым узросце. Асаблівую каштоўнасць мае невядомая да гэтага часу яго паэма «Смарагды кроз». Яе рукапіс захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва БССР і падрыхтаваны для зборніка «Шляхам гадоў» І. Багдановіч і А. Шарахоўскай.

Арыгінальны раздзел «Літаратурныя пенаты», які ўключае артыкул У. Дзянісава «Дзе знаходзіўся дом В. Дуніна-Марцінкевіча?», матэрыял «Замосце: скарбы Аляксандра Ельскага», або, дакладней, роздум Генрыха Ельскага аб музеі свайго дзеда ў перакладзе і з уступным словам Г. Кісялёва.

Тым, хто цікавіцца гісторыяй беларускай літаратуры, будзе цікавы раздзел рэцэнзуемага зборніка пад назвай «Цвяток радзімы васілька...», дзе змешчаны раннія польскамоўныя вершы Янкі Купалы ў перакладзе У. Мархеля і «Песні Камэны» у перакладзе з лацінскай мовы А. Жлутко.

Для аматараў беларускай культуры адкрыццём будуць такія матэрыялы, як «Якімі скарбамі багатыя...» А. Каўкі, «Здабыткі айчыннай мастацкай культуры» У. Конана, «Скарынінскія чытанні ў Мінску» Г. Галенчанкі, «Да адкрыцця Літаратурнага музея Максіма Багдановіча» Л. Хадкевіча.

У рэцэнзуемым зборніку змешчана 31 фатаграфія; некаторыя з іх публікуюцца ўпершыню. Добра, што ў канцы кнігі прыводзяцца кароткія біяграфічныя звесткі аб 24 яе аўтарах.

Зборнік «Шляхам гадоў» — кніга не толькі каштоўная, карысная, але і вельмі патрэбная для тых, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі, беларуска-рускімі і беларуска-польскімі літаратурнымі сувязямі.

Калі б рэцэнзуемы зборнік выйшаў гадоў пяць назад, ён быў бы ўспрыняты зусім інакш. За гэтыя гады з'явілася шмат новых паведамленняў аб жыцці і дзейнасці Кастуся Каліноўскага і Цішкі Гартнага, Янкі Купалы і Якуба Коласа, Вінцука Дуніна-Марцінкевіча і Францішка Багушэвіча, Максіма Багдановіча і Браніслава Тарашкевіча. Сёння «каэфіцыент карыснага дзеяння» зборніка «Шляхам гадоў» зусім не той, як разлічвалі яго аўтары і выдаўцы. Выхад кнігі крыху спазніўся.

Калі б зборнік выйшаў пяць гадоў назад, ён бы адкрыў рэспубліканскаму і саюзнаму чытачу новае імя — яркую і трагічную асобу ў гісторыі беларускай літаратуры першай чвэрці XX ст. Гэта Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі, больш вядомы пад

* Шляхам гадоў. Гісторыка-літаратурны зборнік. Мінск. Мастацкая літаратура. 1990. 365 с.

імем Алеся Гаруна. Але некалькі гадоў назад яго адкрылі або, дакладней, «вярнулі» шырокаму чытачу «Литературная газета» і газета «Літаратура і мастацтва».

Калі б матэрыял ленінградскага кнігазнаўцы М. Мікалаева «Браты Каліноўскія і Публічная бібліятэка» быў апублікаваны ў 1980—1985 гг., цікавасць да яго была б значна вышэй. А ў апошнія гады выйшла некалькі кніг і шмат артыкулаў аб жыцці і дзейнасці К. Каліноўскага.

Пасля публікацый 1989—1990 гг. новых матэрыялаў аб дзейнасці Леніна, Троцкага, Сталіна, Дзяржынскага і Урыцкага наўрад ці што новае пазнае чытач з артыкула Івана Шамякіна «Біяграфія рамана», у якой ідзе гаворка аб даўно выдадзенай кнізе «Петраград—Брэст».

Выйдзі зборнік «Шляхам гадоў» раней, калі пачалося аднаўленне «белых плям» у гісторыі беларускай культуры, каштоўнасць матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці рэпрэсіраваных дзеячаў навукі і культуры Змітрака Жылуновіча (Цішкі Гартнага), Браніслава Тарашкевіча і іншых была б значна большай.

У 1990—1991 гг. плануецца выхад другой і трэцяй частак зборніка (складальнік У. Мархель), а ў 1992 г.— чацвёртай часткі (складальнік Я. Янушкевіч). У такім выпадку паўстае пытанне аб новым падыходзе да падрыхтоўкі такіх кніг, аб карэнным змяненні іх зместу і структуры. Хацелася, каб гэтыя зборнікі былі тэматычнымі або праблемнымі. Складальнікі кніг павінны дакладна паставіць перад сабой мэту: якой тэме або праблеме яны жадаюць прысвяціць зборнік, што новага і цікавага дасць выдаваемая кніга шырокаму чытачу, а не толькі спецыялісту, што новага ўнясе яна ў гісторыю беларускай літаратуры, беларускай культуры?

Зразумела, перад складальнікамі зборнікаў стаяць вялікія цяжкасці. Каб будучыя кнігі былі не толькі навуковымі, але і папулярнымі, трэба ўмела падабраць аўтараў матэрыялаў гэтых кніг. На жаль, у рэцэнзуемым выданні вельмі мала новых імёнаў. Акрамя добра вядомых у нашай рэспубліцы Генадзя Кісялёва і Эрнеста Ялугіна, Уладзіміра Конана і Георгія Галенчанкі, Уладзіміра Содаля і Віталя Скалабана хацелася б сустрэць новыя імёны гісторыкаў і крытыкаў, літаратуразнаўцаў і мастацтвазнаўцаў. Разам з тым не трэба забываць аб такіх цікавых вучоных-літаратуразнаўцах, як Адам Мальдзіс, Алег Лойка і Міхась Мушынскі. Чытачу было б цікава пазнаёміцца з пераацэнкай, з пераасэнсаваннем рада твораў беларускай літаратуры, асабліва Я. Коласа, К. Чорнага, чым займаецца М. Мушынскі.

Матэрыялы будучых зборнікаў павінны быць не толькі цікавымі па зместу, але і абсалютна новымі, г. зн. каб да гэтага нідзе не друкаваліся.

Што датычыцца зборніка «Шляхам гадоў», то, нягледзячы на рад вартасцей, ён, на жаль, не пазбаўлены канкрэтных недахопаў і недакладнасцей. Так, на с. 173 сцвярджаецца, што М. М. Ганчарык быў акадэмікам АН БССР. Гэта недакладнасць. На самай справе ён з'яўляўся членам-карэспандэнтам АН БССР.

Пад фатаграфіяй беларускага паэта Алеся Гаруна прыводзяцца даты яго жыцця — 1887—1919. У публікацыі Н. Мазоўкі «Паэт у няволі. Матэрыялы судовай справы А. Гаруна» на с. 187 год смерці паэта дадзены правільна — 1920. Значыць, пад фатаграфіяй трэба было ўнесці папраўку, або пракаменціраваць, што год яго смерці дадзены няправільна, каб не блытаць чытача, не ўводзіць яго ў зман.

Змяншае каштоўнасць рэцэнзуемай кнігі і тое, што рад яе матэрыялаў да гэтага ўжо публікаваўся ў газетах і часопісах, перадаваўся па радыё. Гаворка ідзе аб артыкуле Івана Шамякіна «Біяграфія рамана» («Петраград—Брэст».— *Э. І.*), дыялогу пісьменніка Эрнеста Ялугіна з гісторыкам Віталем Скалабанам пад назвай «Надпіс на памятным камяні» і інш.

Пакідае жадаць лепшага і знешняе афармленне рэцэнзуемай кнігі.

І ўсё ж трэба вітаць ініцыятыву выдавецтва «Мастацкая літаратура» па выпуску падобных зборнікаў аб невядомых і малавядомых старонках гісторыі беларускай літаратуры.

*Э. Р. ІОФЭ*